МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

31 жніўня 2018 г. № 35 (468)

Штотыднёвы дадатак газеты ЗВЯЗДА

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

Фота БелТА.

Да 2020 года ў Беларусі плануецца пабудаваць 500 станцый абезжалезвання.

ШЛЯХ ДЛЯ ВАДЫ

Якія праблемы водазабеспячэння патрабуюць сёння ўвагі ўлады і грамадзян?

ПРАЦЯГ ТЭМЫ — на 4–16-й стар.

НАД ЧЫМ ПРАЦУЕМ

КОЛЬКІ БАЛАЎ У КІРОЎЦЫ?

Як абмяркоўваюць папраўкі ў закон аб дарожным руху

На днях у Палаце прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Беларусі адбылася рабочая нарада Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі з прадстаўнікамі Міністэрства ўнутраных спраў і іншых ведамстваў па законапраекце «Аб змяненні Закона Рэспублікі Беларусь «Аб дарожным руху», які выклікаў мноства спрэчак у грамадстве. У сустрэчы прыняў удзел і карэспандэнт «МС».

У пачатку — тэорыя

Каб зразумець, пра што ішла гаворка на нарадзе, коратка нагадаем сутнасць прапанаваных паправак. За парушэнні Правілаў дарожнага руху кіроўца атрымлівае пэўную рэгламентаваную колькасць балаў. Адзін бал — гэта парушэнні, штраф за якія не перавышае трох базавых велічынь, а таксама тыя, што былі выяўлены з дапамогай фотафіксацыі. Два балы — парушэнні са штрафам да пяці базавых, тры — да 10 базавых, чатыры — якія прадугледжваюць больш за 10 базавых або пазбаўленне правоў. Атрымліваеш 15 і больш балаў за год — пазбаўляешся права кіравання транспартным сродкам на паўгода.

Ёсць парушэнні, за якія штрафныя балы не налічваюцца. Сярод іх: парушэнне правілаў эксплуатацыі транспартнага сродку — у частцы нумарных знакаў, эксплуатацыя або допуск да ўдзелу ў дарожным руху транспартнага сродку без дагавора абавязковага страхавання грамадзянскай адказнасці ўладальнікаў транспартных сродкаў. Акрамя таго, гэта парушэнне правілаў прыпынку і стаянкі транспартнага сродку, а таксама іншых правілаў дарожнага руху.

Сярод іншых новаўвядзенняў — права здаваць экзамен у ДАІ на машыне з аўтаматычнай каробкай перадач пасля праходжання адпаведнай падрыхтоўкі. У гэтым выпадку правы будуць выдаваць з адпаведнай адзнакай.

Ініцыявана пытанне аб выдачы міжнародных пасведчанняў кіроўцы, таксама працуюць над аспектам допуску да кіравання мотаўсюдыходамі.

Адкрытасць і дысцыпліна

Перад пачаткам мерапрыемства з прэсай пагутарыў **старшыня Пастаяннай камісіі па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце і сувязі Андрэй РЫБАК.** Ён адзначыў, што работа над законапраектам будзе весціся максімальна адкрыта для таго, каб улічыць усе меркаванні — і грамадзян, і дзяржаўных органаў. Паводле яго слоў, сітуацыя на дарогах ускладняецца з кожным днём. Пры гэтым значная частка правапарушэнняў, пра што паведамляюць грамадзяне, — гэта вымушаныя парушэнні з-за недастатковай арганізацыі дарожнага руху. «Наша камісія лічыць, што мы менавіта на гэтым аспекце павінны зрабіць асноўны ўпор», — падкрэсліў дэпутат.

стар. 3

СЁННЯ Ў НУМАРЫ

Рэгіянальнае супрацоўніцтва

Агульнаму беларуска-расійскаму бізнесу ствараюць умовы стар. 2

Чаму перакрылі вентыль?

Людзі абураюцца і просяць вярнуць ім ваду з калгаснай свідравіны стар. 4

Празрыстая — не значыць прыгодная

Нітраты становяцца галоўнай небяспекай калодзежаў стар. 13

Камунальныя тэлефонныя дыспетчарскія

Ствараюць на Віцебшчыне для аператыўнага рэагавання на скаргі стар. 13

Чысціня на вёсцы

Лельчыцкі райсавет ініцыяваў штотыднёвыя суботнікі стар. 16